мальна, паступова пачалі фарміравацца класы буржуазнага грамадства. У выніку была створана сістэма органаў гарадскога самакіравання, якая адпавядала тагачасным запатрабаванням.

## 8.4. Земскае самакіраванне

*(С.А. Талмачова)*

Земская рэформа ў Расійскай імперыі праводзілася з 1864 г. Думка аб неабходнасці ўтварэння асобных органаў мясцовага самакіравання ўзнікла адначасова са складаннем палажэння аб вызваленні сялян ад прыгоннай залежнасці. Па ўказе імператара ад 23 кастрычніка 1859 г. пачалася падрыхтоўка праекта аб пераўтварэнні губернскага кіравання. Пасля абмеркавання ў Савеце міністраў і зацвярджэння Аляксандрам ІІ у 1862 г. Палажэнне аб земскіх установах было надрукавана для агульнага азнаямлення.

1 студзеня 1864 г. Палажэнне аб земскіх установах набыло сілу закону. На працягу 1865–1876 гг. земствы былі ўведзены ў 34 губернях еўрапейскай Расіі і ў вобласці Войска Данскога. Ва ўмовах паўстання 1863–1864 гг. П. Валуеў зрабіў запыт Віленскаму генерал-губернатару аб яго меркаваннях наконт мэтазгоднасці ўвядзення земстваў у Паўночна-Заходнім краі. М. Мураўёў адзначыў, што, на яго думку, «*общее выборное начало, положенное в основание земских учреждений, поставило бы все хозяйственное управление края в зависимость от враждебного нам, большей частью, дворянства, мелкой шляхты и городского сословия польского происхождения и римско-католического вероисповедания и тем самым бы подчинило и крестьянское сословие их влиянию, которым поляки ... не преминули бы воспользоваться ко вреду нашему*».[1] Таму М. Мураўёў выступіў супраць правядзення земскай рэформы ў заходніх губернях, з чым пагадзіўся і Дзяржаўны савет.

Такім чынам, на Паўночна-Заходнія губерні палажэнне аб земствах не распаўсюджвалася. Тлумачылася гэта тым, што земствы ўяўлялі сабой дзяржаўны інстытут, які грунтаваўся на выбарным пачатку і ў пэўнай ступені даваў магчымасць праявіцца грамадскай самастойнасці. Механізм выбараў у земскія ўстановы быў абумоўлены маёмасным цэнзам і забяспечваў перавагу

[1] РДГА. – Ф. 1149. Воп. 13, 1901 г. Спр. 183. Арк. 1.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ